11. *Hall R., Wayman F.* Buying Time: Moneyed Interests and the Mobilization of Bias in Congressional Committees // American Politicai Science Review. 1990. Nr 3. P. 797–820.
12. *Jacobs L., Page B. Who Influences U.S. Foreign Policy Over Time? // American Political Science* Review. 2005. Nr 1. P. 107–124.
13. *Kennickell A.* A Rolling Tide: Changes in the Distribution of Wealth in the U.S., 1989-2001 // Federal Reserve Board, September 2003. http://www.federalreserve.gov/pubs/oss/oss2/papers/concentration Date of reading 2.02.2004.
14. *Kroszner R., Stratmann Th.* Interest Group Competition and the Organization ot Congress: Theory and Evidence from Financial Services Political Action Committees // American Economic Review. 1998. Nr 5. P. 1163–1187.
15. *Langbein L.* Money and Access: Some Empirical Evidence // Journai of Poiitics. 1986. Nr 4. P. 1052–1062.
16. *Larry M., Bernstein J, Boushey H.* The State of Working America, 2002–2003. Ithaca, N.Y., 2003 .
17. *McDonald M., Popkin S.* The Myth of the Vanlshing Voter // American Political Science Review. 2001. Nr 4. P. 963–974.
18. *Michaels B.* Diversity's Faise Soiace // New York Times Magazine. 2004. Nr 11. P. 12–14.
19. *Page B., Shapiro R.* The Rational Public: Fifty Years of Trends in Americans' Poiicy Preferences. Chicago: University of Chicago Press. Pierson, Paul. 1993.
20. *Piketty Th., Saez E.* Income Inequality in the United States, 1913–1998 // Quarterly Joumai ot Economics. 2003. Nr 1. P. 1–39.
21. *Schier S.* By Invitation Oniy: The Rise of Excluslve Politics in the United States. Pittsburgh: University of Pittsburgh Press. 2000.
22. *Sidney V., Schlozman K., Brady H.* Voice and Equaiity: Civic Voluntarism in American Poiitics. Cambridge; Mass, 1995.
23. *Skocpol Th.* Voice and Inequaiity: The Transformation of American Civic Democracy // Perspectives on Politics. 2004. Nr 1. P. 3–20.
24. *Skrentny J.* The Minority Rigthts Revoiution. Cambridge; Massachusetts, 2002.
25. *Smeeding T.* Public Poiicy, Economic Inequaiity, and Poverty: The United States in Comparative Perspective. Revised version of paper presented at the conterence on Inequaiity and American Politics, Maxwell School, Syracuse University (February 2005). <http://www-cpr.maxwell.syr.edu/faculty/smeeding/pdf/campbell%20paper_5.17.04.pdf> Date of reading 21.04.2005.
26. *Zelikow Ph., King D.* C. Why Peopie Don't Trust Government Cambridge, Massachusetts: Harvard University Press. 2004.



**Summary**

The articie is devoted to the problems of sociai inequaiity in American society on the eve of the 21th century. Growing disparity in the ownership of property and income between the rich, the poor and the middie ciass are discussed and illustrated. Long term trends in the distribution of weaith, income and property, and negative political consequences of this process are reveaied and anaiyzed.


15.12.05

УДК 947/987

А. Ф. Вялікі

# СУПОЛЬНАЯ БАРАЦЬБА БЕЛАРУСКАГА І ПОЛЬСКАГА НАРОДАЎ СУПРАЦЬ ГЕРМАНСКАГА АГРЭСАРА Ў 1939–1945 гг.



**Вялікі Анатолій Фёдаравіч**, кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі БДПУ імя М. Танка

*Аналізуецца праблема сумеснай барацьбы беларускага і польскага народаў супраць германскага агрэсара ў час Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў. Беларускі і польскі народы ўступілі ў барацьбу з нямецка-фашысцкімі войскамі ў верасні 1939 г., калі пачалася Другая сусветная вайна. З пачаткам Вялікай Айчыннай вайны беларусы і палякі прадоўжылі сумесную барацьбу ў савецкіх партызанскіх фарміраваннях і ў фарміраваннях Арміі Краёвай у заходнім рэгіёне Беларусі. У 1943 г. у СССР было створана Войска Польскае пад камандаваннем З. Берлінга, у складзе ўзброеных сіл якога на савецка-германскім фронце разам змагаліся беларусы і палякі. У гады Другой сусветнай вайны палякі і беларусы мужна змагаліся і на заходнім тэатры ваенных дзеянняў у Польскай арміі пад камандаваннем генерала У. Андэрса. У айчыннай ваеннай гістарыяграфіі адсутнічае комплекснае аналітычнае даследаванне дадзенай праблемы, таму актуальным з'яўляецца яго напісанне.*

Сумесная барацьба беларускага і польскага народаў у гады Другой сусветнай вайны выклікала і выклікае цікавасць даследчыкаў ободвух краін да вывучэння гэтай праблемы.

Разам з тым у беларускай савецкай і польскай гістарыяграфіі перыяду СССР і ПНР панаваў пункт гледжання, што беларусы і палякі ў час Другой сусветнай вайны змагаліся супраць нямецкай агрэсіі выключна ў шэрагах савецкіх партызан, Чырвонай Арміі, Войска Польскага пад камандаваннем З. Берлінга [1–5]. Гэтыя і іншыя працы былі напісаны ў рэчышчы канцэпцыі савецка-польскай баявой садружнасці і дапамогі СССР у фарміраванні ўзброеных сіл народнай Польшчы.

У 90-х гг. XX ст. кардынальна змяніліся канцэптуальныя падыходы айчынных і польскіх гісторыкаў пры разглядзе падзей Другой сусветнай вайны, асабліва што тычылася баявой дзейнасці савецкіх партызан і фарміраванняў Арміі Краёвай на тэрыторыі Заходняй Беларусі, а таксама баявога шляху Польскай арміі пад камандаваннем генерала У. Андэрса [6–10]. Разам з тым у айчыннай гістарыяграфіі недастаткова поўна асветлена праблема барацьбы беларускага і польскага народаў на ўсіх тэатрах ваенных дзеянняў. Аўтар спрабуе паставіць пытанне аб неабходнасці комплекснага вывучэння дадзенай праблемы.

Нападаючы на Савецкі Саюз Гітлер назваў яго «калосам на гліняных нагах», бо, па яго меркаваннях, шматлікія нацыі і народы, якія ўваходзілі ў склад СССР, стануць на бок Германіі і яе сатэлітаў. Аднак гэта быў адзін з важнейшых стратэгічных пралікаў агрэсара. Так, былі здраднікі і калабарацыяністы розных нацянальнасцей, якія сталі паслугачамі немцаў. Разам з тым амаль усе народы СССР змагаліся з чужынцамі, якія прыйшлі на нашую зямлю. У шэрагах змагароў з фашыстамі мужнасць, адвагу, гераізм праявілі тысячы палякаў, пачаўшых з беларусамі барацьбу з немцамі 1 верасня 1939 г.

У Войску Польскім Другой Рэчы Паспалітай беларусы складалі 9,5% ваеннаслужачых і з'яўляліся другой па колькасці, пасля украінцаў нацыянальнасцю [10, с. 208]. Шмат беларусаў служылі ў пяхотных, танкавых часцях, на флоце, у кавалерыі. Пасля нападу Германіі на Польшчу многія беларусы былі прызваны ў палкі «Сноў», «Сноў-1», «Валожын», «Вілейка», што ўвайшлі ў склад армій «Лодзь», «Кракаў» і ўступілі ў баі з немцамі. Гераічная абарона фарта № 2 Брэсцкай крэпасці 8–27 верасня 1939 г. вялася аддзяленнямі 82-й пяхотнай дывізіі, якая ў большасці была ўкамплектавана праваслаўнымі беларусамі.

Беларусы, якія ваявалі разам з палякамі ў вераснёўскай кампаніі 1939 г. у складзе Войска Польскага, складалі значную частку. З 300 тыс. польскіх ваеннапалонных, якія апынуліся ў нямецкім палоне, ад 40 да 70 тыс. назвалі сябе беларусамі [10, с. 209]. Адзначым, што ў вераснёўскіх баях пад Гдыняй удзельнічаў тады яшчэ радавы 2-га батальёна марской пяхоты Войска Польскага Янка Брыль, будучы Народны пісьменнік Беларусі.

Польскія афіцэры адзначалі мужнасць палякаў і беларусаў, праяўленыя імі ў баях з немцамі. Так, генерал У. Андэрс у размове з І. Сталіным у снежні 1943 г. адзначыў, што «беларусы былі добрымі салдатамі яшчэ ў верасні 1939 г.». У дакладах польскіх афіцэраў таксама падкрэслівалася мужнасць і гераізм беларускіх салдат: «Беларусы вельмі лаяльна адносіліся да мабілізацыі і гатовыя падзяляць з палякамі ўсе радасці і горычы» [6, с. 167].

Вялікая Айчынная вайна прынесла беларускаму і польскаму народам новыя выпрабаванні. У палітыкаў былі свае планы, узаемаадносіны, меркаванні. Але тыя палякі і беларусы, якія змагаліся з ворагам у беларускіх лясах, разам пераносілі цяжкасці ваенных дзён – блакады, фашысцкія аблавы, карныя экспедыцыі. Палякаў і беларусаў аб'ядноўвала адно – неабходнасць змагацца з агульным ворагам – моцным, жорсткім, бязлітасным. У гэтай барацьбе польскія салдаты з фарміраванняў Арміі Краёвай (АК) і савецкія партызаны знаходзілі ўзаемаразуменне. Прыклады баявога супрацоўніцтва паміж імі адзначаліся ў многіх рэгіёнах Заходняй Беларусі. Савецкія і польскія антыфашысты дамаўляліся аб месцах дыслакацыі, сумесных баявых аперацыях, забяспячэнні зброяй і боепрыпасамі, абмене разведвальнымі данымі, паведамленнямі аб нямецкіх аблавах і арыштах, а таксама аб сваіх перамяшчэннях, рэйдах і баявых дзеяннях. Пры дапамозе салдат АК былі вызвалены сотні чырвонаармейцаў з лагера ваеннапалонных у Маладзечна, якія уступілі ў савецкія партызанскія атрады ў Налібоцкай пушчы [7, с. 247]. Брэсцкім падпольным «Камітэтам барацьбы з нямецкімі акупантамі» былі ўсталяваны шырокія сувязі з польскімі ваеннымі арганізацыямі і служачымі, якія працавалі ў нямецкіх установах на тэрыторыі Брэсцкай, Баранавіцкай і Беластоцкай абласцей. Польскія падпольшчыкі перадавалі савецкім партызанам і падпольшчыкам зброю и боепрыпасы, паперу для друкарняў, папярэджвалі пра аблавы і арышты, перадавалі каштоўныя разведданыя аб гітлераўцах і іх агентах.

Прыкладам паспяховага супрацоўніцтва партызан з фарміраваннямі АК можа быць сям'я Дзяржынскіх – Казіміра, брата Ф. Дзяржынскага і яго жонкі Люцыі. Яны пражывалі ў Івянцы і праз сваю агентуру дабывалі каштоўныя звесткі аб аб'ектах праціўніка. Па іх інфармацыі савецкім партызанам стаў вядомы план мястэчка Чырвонае, якое з'яўлялася

буйной ваеннай базай немцаў. Партызаны перадалі гэту інфармацыю ў Беларускі штаб партызанскага руху, а адтуль яна трапіла ў франтавую авіяцыю, якая разбамбіла ваенную базу немцаў у Чырвоным [7, с. 248].

У Налібоцкай пушчы спачатку добрыя ўзаемаадносіны склаліся паміж атрадамі АК (больш за 300 чал.) пад камандаваннем Каспера Мілашэўскага і Івянецкім партызанскім злучэннем пад камандаваннем Рыгора Сідарка (Дубава). У мястэчку Налібокі беларускія і польскія атрады 11 жніўня 1942 г. знішчылі нямецкую калону разам з навагрудскім гебітскамісарам, а ноччу 17 жніўня 1942 г. разграмілі атрад немцаў [7, с. 248]. У чэрвені 1943 г. у час разгрому атрадам Мілашэўскага моцнага нямецкага гарнізона ў Івянцы брыгада імя Чкалава перакрыла навакольныя дарогі і тым самым дала акаўцам магчымасць без страт адысці ад месца дыслакацыі [8, с. 157].

Пляча ў пляча стаялі беларускія і польскія партызаны ў час блакады немцамі Налібоцкай пушчы ў ліпені–жніўні 1943 г. Пра маштаб карнай аперацыі пад кодавай назвай «Герман» сведчыць факт, што немцы прыцягнулі для блакады партызан амаль 60-тысячнуя групоўку, якая мела на ўзбраенні авіяцыю, танкі, артылерыю. Тры дні беларускія і польскія партызаны стрымлівалі атакі мацнейшых сіл праціўніка, а потым з баямі прарываліся з акружэння. У ходзе аперацыі «Герман» немцы не выканалі пастаўленых задач.

У Нарачанскай партызанскай зоне побач з фарміраваннямі Ф. Маркава з вясны 1943 г. быў арганізаваны першы польскі партызанскі атрад Віленскай акругі АК пад камандаваннем А. Бужынскага (Кміціца), былога аднакурсніка Ф. Маркава па Свянцянскай настаўніцкай семінарыі. Беларусы і палякі разам дыслацыраваліся, узгаднялі свае дзеянні, праводзілі сумесныя акцыі. У прыватнасці, разграмілі гарнізон у Кабыльніку (цяпер Нарач), ліквідавалі паліцэйскі ўчастак у в. Вайстоме, раззброілі нямецкую жандармерыю на пераправе праз Вілію [8, с. 158].

Адзначым, што сумеснае баявое супрацоўніцтва з лета 1943 г. пачынае пагаршацца. У першую чаргу гэта было звязана з вызначэннем савецка-польскай мяжы. «Вялікая палітыка» паўплывала на ранейшую сумесную барацьбу і прывяла да канфрантацыі паміж беларускімі партызанамі і фарміраваннямі АК.

Нагадаем шлях Войска Польскага, баявое хрышчэнне якога адбылося на беларускай зямлі. У маі 1943 г. па ініцыятыве Саюза польскіх патрыётаў (СПП) і з дазволу І. Сталіна ў СССР пачала фарміравацца 1-я пяхотная дывізія імя Т. Касцюшкі, якую ўзначаліў З. Берлінг. Польская дывізія ў асноўным фарміравалася за кошт ураджэнцаў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. У сувязі з гэтым сярод мабілізаваных і добраахвотнікаў налічвалася многа беларусаў. На 1 студзеня 1944 г. у шэрагах касцюшкаўцаў служыў 171 беларус, у тым ліку 16 афіцэраў [6, с. 376].

Баявы шлях дывізія пачала каля вёскі Леніна Магілёўскай вобласці. За два дні баёў злучэнне страціла 1 015 чалавек загінуўшымі і параненымі, у тым ліку 281 беларуса [6, с. 376]. Многія нашы суайчыннікі паказалі прыклады мужнасці і гераізму ў час гэтай бітвы. Маёр Б. Ляховіч з Віцебшчыны гераічна загінуў у баі, падымаючы салдат у атаку. Гераізм беларусаў і палякаў пад Леніна 12 кастрычніка 1968 г. урад ПНР адзначыў узнагародай беларускай вёскі Леніна ордэнам Крыжа Грунвальда III ступені.

У жніўні 1943 г. пачалося фарміраванне 1-га польскага корпуса. У выніку былі створаны 2-я, 3-я, 4-я пяхотныя дывізіі, 1-я танкавая брыгада імя Герояў Вестэрплятэ. У сакавіку 1944 г. пачалося фарміраванне 1-й Польскай арміі. На чэрвень 1944 г. польскія ўзброеныя сілы складалі звыш 77 тыс. чал. Па даных савецкага і польскага камандавання на 1 чэрвеня 1944 г. толькі ў чатырох польскіх дывізіях служыла 718 салдат і 199 афіцэраў беларусаў па паходжанні [6, с. 376].

У перыяд з жніўня па снежань 1944 г. у заходніх абласцях БССР для папаўнення Войска Польскага быў праведзены прызыў добраахвотнікаў польскай нацыянальнасці. Пры савецкіх ваенкаматах працавалі польскія афіцэры, якія займаліся ўлікам дабраахвотнікаў і адпраўкай іх да месца дыслакацыі ці фарміравання польскіх дывізій. У выніку прызыву ў Войска Польскае было залічана 41 072 чал. Значную колькасць з іх складалі этнічныя беларусы. Многія беларусы называлі сябе палякамі, каб трапіць у Войска Польскае, бо яны мелі вопыт службы ва ўзброеных сілах Польшчы. У некаторых фарміраваннях колькасць ураджэнцаў Беларусі складала каля 20%. Дя іх ліку магчыма аднесці 33-і, 35-ы, 37-ы палкі 7-й пяхотнай дывізіі 2-й арміі Войска Польскага [6, с. 377]. Увогуле з мая 1943 па чэрвень 1945 г. у польскія ваенныя фарміраванні было накіравана 18 тыс. савецкіх афіцэраў, у тым ліку 876 (4,4%) беларусаў. Аднак гэта лічба падаецца заніжанай, бо ў шэрагу вынікаў многія беларусы ў асабовых дакументах пазначаліся як палякі.

Пасля вайны некаторыя беларусы засталіся служыць у Войску Польскім. У пасляваенныя гады ва ўзброеных сілах ПНР служылі 63 афіцэры-беларусы, у тым ліку 16 генералаў. Сярод іх Б. Кеневіч, П. Ярашэвіч, В. Корчыц, П. Раткевіч, Б. Несцяровіч і інш. [6, с. 378].

Многія беларусы прымалі ўдзел у баявых аперацыях, мужна змагаліся з ворагам на польскай зямлі і там загінулі. Сярод 17 572 загінуўшых і прапаўшых без звестак салдат і афіцэраў Войска Польскага 4 687 – ураджэнцы Беларусі. У ліку загінуўшых варта адзначыць беларуса, камандзіра 5-й пяхотнай дывізіі Героя Савецкага Саюза генерала А. А. Вашкевіча, які гераічна загінуў 22 красавіка 1945 г. каля г. Баўтцэн, у час правядзення Берлінскай аперацыі. А. А. Вашкевіч пахаваны ў Варшаве [6, с. 378]. Многія беларусы, якія змагаліся разам з палякамі ў фарміраваннях 1-й і 2-й армій Войска Польскага, узнагароджаны польскімі і савецкімі ордэнамі і медалямі.

У гады Другой сусветнай вайны палякі і беларусы змагаліся разам і ў арміі генерала У. Андэрса. Найбольшая колькасць нашых суайчыннікаў знаходзілася ў польскіх ваенных фарміраваннях на Захадзе, якія ў аператыўных адносінах падпарадкоўваліся брытанскаму ваеннаму камандаванню. 30 чэрвеня 1941 г. паміж СССР і Польшчай было падпісана пагадненне аб аднаўленні дыпламатычных адносін і супрацоўніцтве ў вайне супраць нацысцкай Германіі. 14 жніўня 1941 г. у Маскве быў падпісаны савецка-польскі дагавор, які вызначыў асновы стварэння на тэрыторыі СССР польскай арміі з ліку польскіх грамадзян. На працягу жніўня 1941 г. першай паловы 1942 г. у польскую армію было прызвана каля 50 тыс. «спецперасяленцаў». Да снежня 1941 г. беларусы прызываліся на аснове таго, што да пачатку Другой сусветнай вайны яны з'яўляліся польскімі грамадзянамі. У пачатку сакавіка 1942 г. колькасны склад польскіх фарміраванняў у Савецкім Саюзе перавысіў 60 тыс. чал., а да жніўня склаў 70 тыс. [6, с. 367].

На аснове польска-савецкіх адносін польскія фарміраванні былі эвакуіраваны ў Іран, а потым перадыслацыраваны ў Палесціну і Егіпет. У Польскай арміі на ўсходзе апынулася значная колькасць беларусаў. Па даных беларускага гісторыка Ю. Грыбоўскага сярод ваеннаслужачых 2-га Польскага корпуса (52 688 чал.) беларусаў налічвалася звыш 6 тыс. чал. [9, с. 17].

У снежні 1943 г. 2-гі польскі корпус у складзе 8-й Брытанскай арміі быў перадыслацыраваны ў Італію, дзе прымаў удзел у ваенных дзеяннях да іх завяршэння ў красавіку 1945 г. Да ліку найбольш значных бітваў, у якіх удзельнічалі беларусы, неабходна аднесці баі на поўдні Італіі (люты–красавік 1944 г.), бітва пад Монтэ-Касіна (16–20 мая 1945 г.), баі на Адрыятычным узбярэжжы (1–18 чэрвеня 1945 г.), узяцце Балонні (9–11 красавіка 1945 г) і інш.

У час баявых дзеянняў 2-га Польскага корпуса на італьянскім фронце воіны-беларусы разам з палякамі вылучаліся надзвычайнай мужнасцю і адвагай. Падпаручык 5-й дывізіі П. Сыч, які быў двойчы паранены ў час бітвы за Монтэ-Касіна, аднак не пакінуў поле боя, ва ўспамінах адзначаў: «Беларусы шчодра амылі сваёй крывёю дзікія горы каля кляштара Монтэ-Касіна» [9, с. 54]. У час бітвы за Монтэ-Касіна страты 2-га Польскага корпуса склалі 924 чалавекі забітымі і 94 прапаўшымі без звестак. Ураджэнцаў Беларусі сярод загінуўшых налічвалася 180 чалавек [9, с. 27]. Беларусы пакпалі сваё жыццё і за вызваленне іншых гарадоў Італіі. За перыяд італьянскай кампаніі (1943–1945 гг.) 2-гі Польскі корпус панёс істотныя страты. Беларусы ляжаць на военных могілках гарадоў Ларэта – 234 чалавекі, Касамасіма – 72, Балонні – 287 і іншых могілках італьянскіх гарадоў [6, с. 369].

Аб мужнасці і гераізме беларусаў з корпуса генерала У. Андэрса ў час баёў у Італіі сведчаць высокія італьянскія, брытанскія і польскія баявыя ўзнагароды, якія атрымалі нашы земляркі. 80 ураджэнцаў Беларусі былі ўзнагароджаны польскай баявой узнагародай Крыжом Адважных [9, с. 19]. С. Я. Янушка, ураджэнец вёскі Прудчы Шчучынскага раёна, кананер 5-га артылерыйскага палка, 5-й дывізіі быў узагароджаны двойчы. 7 беларусаў былі ўзнагароджаны Сярэбраным Крыжом Заслуг з Мячамі. 45 нашых суайчыннікаў сталі кавалерамі Бронзавага Крыжа Заслуг з Мячамі. Некалькі беларусаў атрымалі вышэйшую польскую ўзнагароду – ордэн «Virtuti Miiitari», а таксама італьянскі крыж «Al Voiar Miiitare» (За ваенныя заслугі) [6, с. 371].

Большасць беларусаў 2-га Польскага корпуса з'яўляліся радавымі, аднак сярод іх было шмат афіцэраў. Сярод іх польскія генералы, ураджэнцы Заходняй Беларусі – камандзір 2-й танкавай брыгады Г. Пашкевіч з-пад Ліды, камандзір сувязі 2-й Варшаўскай танкавай дывізіі ўраджэнец Пінска палкоўнік Е. Казакевіч і інш.

Адзначым, што пасля вайны многія з іх вярнуліся ў Беларусь. Сярод беларусаў, якія вярнуліся на Радзіму былі ўдзельнікі вызвалення Італіі і бітвы за Монтэ-Касіна І. Жмойдзін з-пад Маладзечна і М. Валынец з Вілейкі, служыўшыя капраламі 5-й дывізіі 2-га Польскага корпуса. У 1944 г. у сувязі з 50-годдзем бітвы за Монтэ-Касіна яны наве-

далі могілкі вышыні Касіна і ад імя ўсіх беларусаў з арміі Андэрса аддалі даніну павагі палеглым. Разам з ветэранамі іншых краін яны прынялі ўдзел у святкаваннях узяцця вышыні Касіна [6, с. 373].

Такім чынам, у агульнай барацьбе з фашысцкай агрэсіяй гераічна змагаліся беларусы і палякі. Яны змагаліся і на ўсходнім фронце, дзе вырашаўся лёс Другой сусветнай вайны, і ў складзе Войска Польскага пад камандаваннем З. Берлінга. Мужнасць і гераізм яны паказалі і на еўрапейскім тэатры баявых дзеянняў у Польскай арміі генерала У. Андэрса. Разам змагаліся палякі і беларусы ў шэрагах беларускіх партызан, падпольшчыкаў і ў фарміраваннях Арміі Краёвай. Разам яны набліжалі Вялікую Перамогу. Аднак фрагментарнасць, канцэнтрацыя на вывучэнні асобных тэм не дае магчымасці стварэння цэласнай і аб'ектыўнай карціны сумеснай барацьбы братніх народаў супраць германскай агрэсіі ў 1939–1945 гг.

**Літаратура**


1. *Поплавский С.Г.* Боевые действия народного Войска Польского. М., 1961.
2. *Жилин П.А.*, *Ядзяк Э.М.* Братство по оружию.. М., 1976.
3. *Толстой В.С.* Братское сотрудничество белорусского и польского народов. Минск, 1966.
4. *Jurgelewicz W.* Organizacja Ludowego Woiska Poiskiego. Warszawa, 1968. S. 154.
5. *Kaczmarek K.* Druga Armia Woiska Poiskiego. Warszawa, 1978. S. 760.
6. Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941–1945 гг. / А.А. Коваленя (рук. авт. коллектива) [и др.]; под общ. ред. А.А. Ковалени. Минск, 2005.
7. Польское подполье на территории западных областей Беларуси (1939–1954 гг.) : монография / С.А. Ситкевич, С.А. Сильванович, В.В. Барабаш, Н.А. Рыбак. Гродно, 2004.
8. *Сямашка А.І.* Армія Краёва на Беларусі. Мінск, 1994.
9. *Грыбоўскі Ю.* Беларусы ў бітве за Монтэ-Касіна : арт., дак. Мінск, 2004.
10. *Грыбоўскі Ю.* Беларусы ў войску міжваеннае Польшчы (1921–1939) // Спадчына. 2001. № 3. С. 208.
11. *Zaron P.* Armija Andersa. Torun, 2000. S. 322.



**Summary**

The article refiects the joint struggle of the Belarussians and Poles during World War II against German's invaders. They fought jointly against invaders in soviet parfizan's armed forces, in Poiish Army under the commander of generai W.Anders, in Poiish army under the commander of Z.Berling and in the armed forces of Armia Kraiova.


13.04.06

УДК 002

Е. И. Дмитриев

## КЛАССИФИКАЦИЯ АУДИТОРИИ СМИ КАК СУБЪЕКТОВ ИНФОРМАЦИОННОГО ПРОСТРАНСТВА



**Дмитриев Евгений Иванович**, кандидат социологических наук, доцент кафедры социологии журналистики БГУ

*Рассматривается аудитория СМИ как субъект информационного пространства, анапизируются параметры термина «аудитория СМИ» с позиции социологии журналистики. Представлена авторская системная классификация аудиторий СМИ, опирающаяся на данные изучения информационного пространства Беларуси.*

В социальном взаимодействии СМИ и аудитории мы имеем дело с неповторяющимися социальными ситуациями, что не дает возможности однозначно формализовать это взаимодействие. Основное препятствие состоит в том, что взаимодействие СМИ и аудитории связано непосредственно с информационным и социальным поведением реальных людей и их отношением к телевидению, радио, газетам, которое зависит от многих причин и условий, вычленить и описать которые может лишь сам человек, превращая их в субъективные детерминанты, прежде всего в ценности и поведенческие установки. Субъекты информационного пространства – СМИ и аудитория – ведут себя не как одинаковые шары на бильярдном столе и поэтому смоделировать их оптимальное взаимодействие с помощью формальной либо математической логики чрезвычайно сложно.

Таким образом, социальное моделирование аудиторий СМИ должно быть аналоговым. Наиболее целесообразной формой аналоговых социальных моделей являются организационно-структурные и технологические схемы социального взаимодействия. Схемы